ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
“ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК
БЕЛАРУСІ”

Аб’ект аўтарскага права

УДК 39(=161.3):581.6(091)(043.3)

**ШАЎЧЭНКА ЯНА СЯРГЕЕЎНА**

# НАРОДНЫЯ ВЕДЫ ПРА ДЗІКАРОСЛЫЯ РАСЛІНЫ Ў ТРАДЫЦЫЯХ БЕЛАРУСАЎ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XXI СТ.)

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

Мінск, 2023

Работа выканана ў аддзеле нарадазнаўства ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Ракава Любоў Васільеўна**, доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Казакова Ірына Валер’еўна**, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта<br>**Шумскі Канстанцін Анатольевіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, навуковы супрацоўнік Музея эксперыментальных навук “Эксперыментус”. |
| Апаніруючая арганізацыя: | **УА “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай”.** |

Абарона адбудзецца 20 снежня 2023 года ў 11.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацыі Д.01.42.01 пры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літературы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072 г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, ауд. 302; тэлефон вучонага сакратара: 270-29-24; E-mail: tyapkova-anna@mail.ru.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Аўтарэферат разасланы 20 лістапада 2023 г.

Вучоны сакратар совета па
абароне дысертацый, кандыдат
гістарычных навук, дацэнт Г. І. Цяпкова

# УВОДЗІНЫ

Народныя веды пра дзікарослыя расліны – важная частка культурнага вопыту этнасу, якая мае выразную этнічную спецыфіку. Актуальнасць працы абумоўлена неабходнасцю павышэння экалагічнай самасвядомасці беларусаў, вяртання да традыцый рацыянальнага прыродакарыстання, усведамлення непарыўнасці сувязі чалавека з прыродай, што з’яўляецца важнай складнікавай часткай сучаснага жыцця грамадства. Вырашэнне дадзенай задачы этналагічнай навукай садзейнічае больш глыбокаму разуменню як уласна традыцыйнай духоўнай культуры, так і тэндэнцый развіцця сучасных этнакультурных працэсаў.

Пад дзікарослымі раслінамі мы маем на ўвазе сукупнасць раслін, якія лакалізуюцца ў ландшафтнай прасторы, незасвоенай чалавекам (поле, балота, луг, лес). Дзікарослы раслінны свет падзяляецца на шэраг асноўных элементаў, сярод якіх вылучаюцца: дрэвы, пладовыя кусты/хмызнякі, травы. Гаворачы пра народныя веды аб дзікарослых раслінах, мы маем на ўвазе веды аб выкарыстанні дзікарослых раслін, заснаваныя на ўяўленнях аб іх паходжанні, прыродных уласцівасцях і месцы ў традыцыйнай карціне свету беларусаў. Традыцыю (лац. “traditio” – перадача) мы вызначаем як сукупнасць элементаў сацыяльнай і культурнай спадчыны, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне і захоўваецца на працягу доўгага часу.

Важнасць вывучэння народных ведаў беларусаў, звязаных з дзікарослымі раслінамі, абумоўлена перш за ўсё спецыфікай прыродных умоў. Тэрыторыя Беларусі характарызуецца наяўнасцю велізарных лясных масіваў (каля 40%), што дазваляе ў вялікіх маштабах выкарыстоўваць дзікарослыя расліны ў штодзённым жыцці, а таксама ў абрадах каляндарнага і сямейнага цыкла. Відавая разнастайнасць дзікарослага расліннага свету налічвае каля 400 відаў раслін, большасць з якіх складаюць травы, таму ў даследаванні на іх акцэнтуецца значная частка ўвагі.

Навуковая значнасць тэмы дысертацыі базіруецца на тым, што ў айчыннай этналагічнай навуцы народныя веды пра дзікарослы раслінны свет у традыцыях беларусаў раней *не з’яўляліся прадметам комплекснага этналагічнага даследавання*. Гэта праблема патрабуе сістэматызацыі назапашанага матэрыялу ў межах беларускай этналогіі, з выкарыстаннем здабыткаў іншых дысцыплін – гісторыі, фалькларыстыкі, этнабатанікі, этнаэкалогіі, лінгвістыкі.

Аналізуючы народныя веды беларусаў пра дзікарослыя расліны, мы робім акцэнт на іх месцы ў матэрыяльнай культуры, ахопліваючы сферу іх штодзённага побытавага выкарыстання; значэнні дзікарослага расліннага свету ў духоўнай культуры беларусаў у межах каляндарнай і сямейнай

абраднасці, дзе разглядаецца іх функцыянальны аспект; ролі ведаў пра дзікарослыя расліны ў этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь, іх месцы ў сучасным інфарматызаваным і глабалізаваным грамадстве. Дысертацыйная работа пашырае веды па гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў і робіць унёсак у комплекснае даследаванне беларускага этнасу канца XIX – пачатку XXI ст.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі)**

Дысертацыя выканана ў межах наступных навуковых праграм і праектаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры: падпраграма 12.1 “Гісторыя і культура” Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг., зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.06.2015 г. № 483, пастановай Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ад 30.11.2015 г. № 55 “Аб зацверджанні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў”, тэма 01.02.05. “Сучасныя этнічныя традыцыі Рэспублікі Беларусь”; 2.4. «Выяўленне самабытнага характару матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры беларусаў, этнічных традыцый і этнакультурнага ўзаемадзеяння культуры беларускага народа і культур іншых народаў на тэрыторыі Беларусі і ў іншых краінах у сістэме сацыягуманітарнай і эканамічнай бяспекі дзяржавы» падпраграмы № 2 «Культура і мастацтва» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2021 – 2025 гг. "Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы".

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта – выявіць заканамернасці развіцця народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст.

Задачы даследавання:

1. Ахарактарызаваць асноўныя аспекты выкарыстання дзікарослых раслін у матэрыяльнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.;
2. Вызначыць ролю дзікарослых раслін у духоўнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.;
3. Выявіць значэнне ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучасных этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь.

**Аб’ект і прадмет даследавання**

Аб’ектам даследавання з’яўляецца беларускі этнас.

Прадметам даследавання з’яўляюцца народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Традыцыя выкарыстання дзікарослых раслін у матэрыяльнай культуры беларусаў склалася гістарычна пад уплывам геаграфічнага і прыродна-кліматычнага фактараў. Дзікарослыя расліны актыўна выкарыстоўваліся ў штодзённым побыце беларусаў. Назапашвалася драўніна – для будаўніцтва, вырабу побытавых рэчаў, мэблі, начыння; расліннасць, яе плады, карані – для прыгатавання і захавання ежы, у якасці фарбавальнікаў для адзення, венікаў для лазні. Для будаўніцтва выкарыстоўвалася драўніна *хвоі, елкі і дуба*, для вырабу мэблі ў хату – драўніна *бярозы і алешыны.* Расліны актыўна выкарыстоўваліся ў якасці лекавых сродкаў у шматлікіх відах і формах і збіраліся як для ўласных патрэбаў, так і на продаж. На пачатак XX ст. найбольш папулярнымі аб’ектамі збору па рэгіёнах з’яўляліся: Гомельшчына – *мята і рамонкі, багульнік (багун), дзераза, дзівасіл, васілёк, святаяннік*, *ландыш, падбел;* Рагачоўшчына – *палын, шалфей, мята, ліпавы цвет, сасновыя і яловыя шышкі*; Мсціслаўшчына – *талакнянка, белена, ваўчкі, іван-да-мар’я, дубовая кара, крушына, ядловец*; Барысаўшчына – *крушына, спарыш, чальчак, аер, дубраўка, мацярдушка*; Віцебшчына – *трыпутнік, чыстацел, святаяннік, бузіна, почкі бярозавыя і ліпавыя, ядловец* і г.д. Рэгіянальная спецыфіка выкарыстання раслін праяўляецца ў наяўнасці лакальных рэгіянальных назваў для асобных траў (напрыклад, калган – *дуброўка, дзеравянка, узік, вязь-трава, сурмоліна, завязны корань*; васількі – *букаўнік, бычыннік, валынкі; іван-да-мар’я – “брат-і-сястра”, мар’яннік, браткі***)**. Традыцыя назапашвання лекавых дзікарослых раслін адрознівалася сваёй спецыфікай на Усходнім Палессі, дзе яна характарызавалася павялічанай увагай да збору таксічных раслін (*чамярыца, багун*). Гэта тлумачыцца як асаблівасцямі мясцовай флоры, так і міжэтнічным узаемадзеяннем. Традыцыя ўжывання раслін у матэрыяльнай культуры актуалізуецца ў сувязі з папулярызацыяй у сродках масавай інфармацыі. У сучаснасці назіраецца тэндэнцыя актывізацыі выкарыстання народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў масавай прамысловай вытворчасці (выпуск гарбаты з *мяты, іван-чаю, чабору, васілька*). *Упершыню ў айчыннай этналогіі вызначана рэгіянальная спецыфіка і заканамернасці трансфармацыі выкарыстання ведаў пра дзікарослыя расліны ў матэрыяльнай культуры канца XIX – пачатку XXI ст.*

2. Асноўнымі функцыямі дзікарослых раслін з’яўляліся *апатрапейная, медыятыўная, прадуцыравальная, лекавая,* якія праяўляліся ў двух цыклах

абраднасці беларусаў – каляндарнай і сямейнай. У каляндарнай абраднасці дрэвы ўвасаблялі сімвалічнае значэнне свята (яліна як сімвал неўміручасці на Каляды, вярба як аналаг пальмавай галіны на Вялікдзень, бяроза як сімвал маладосці і росквіту на Троіцу). Разнастайнасць лакальных традыцый (актыўнае выкарыстанне ядлоўца на Падзвінні і Панямонні; нарыхтоўка чарніц на Купалле на Палессі і на поўдні Цэнтральнай Беларусі) з'яўлялася следствам прыродна-ландшафтных асаблівасцей рэгіёнаў. Рэгіянальная спецыфіка прасочваецца ў выкарыстанні ў купальскай абраднасці розных відаў раслін у якасці медыятараў (на Берасцейшчыне гэта "доля", на Гомельшчыне – купалка, "пукайла", у Цэнтральнай Беларусі – трыпутнік, на Падзвінні – "загадачка"). Назіраецца тэндэнцыя знікнення адных традыцый разам з яе носьбітамі (выкарыстанне дзікарослай расліннасці на Вербныя Дзяды), і ўзнаўлення іншых (купальская традыцыя). Традыцыя ўпрыгожвання вербнай галінкі жывымі кветкамі і раслінамі трансфармуецца і набывае новыя элементы, што праяўляецца ў выкарыстанні кветак са штучных матэрыялаў прамысловага вырабу.

У межах сямейнага цыкла абраднасці беларусаў дзікарослыя расліны актыўна выкарыстоўваліся ў пасляродавым цыкле радзіннай абраднасці ў якасці апатрапейных і лекавых сродкаў. У межах асобных рэгіёнаў выкарыстанне адных відаў траў пераважала над іншымі: на Ўсходнім Палессі ў абрадзе першага купання актыўна ўжываецца *любіста, буркун*, у лакальнай традыцыі на Панямонні – *румянка.* З ростам узроўню адукацыі насельніцтва прымяняе расліны прыярытэтна з практычнай гігіенічнай патрэбай. Народныя ўяўленні аб выкарыстанні дзікарослых раслін у вясельнай абраднасці звязваліся з раслінамі-медыятарамі, што мелі выразную шлюбную сімволіку і маркіравалі пераход маладых з аднаго сацыяльнага статуса ў іншы. У палескай традыцыі аздаблення каравая прымянялі галінкі *каліны, ядлоўца, вішні, яблыні,* а таксама *рамонак і барвінак.* Выкарыстанне дзікарослых раслін у вясельным абрадзе трансфармуецца ў бок замены жывых раслін вырабамі са штучных матэрыялаў з эстэтычнай мэтай. У пахавальнай абраднасці расліны ўжываліся на ўсіх этапах абраду і выступалі своеасаблівымі маркерамі полаўзроставай прыналежнасці і сацыяльнага статуса нябожчыка. Традыцыя выкарыстання раслін у пахавальнай абраднасці часткова трансфармуецца разам з актыўным развіццём сферы рытуальных паслуг (з абраду знікае элемент выкарыстання дзікарослых раслін для падкладвання іх у труну). *Упершыню ў беларускай этналогіі вызначаны лакальныя асаблівасці, асноўныя заканамернасці і прычыны*

*трансфармацыі ведаў аб дзікарослых раслінах у духоўнай культуры канца XIX – пачатку XXI ст.*

3. Раслінныя сімвалы з'яўляюцца важнымі асацыятыўнымі вобразамі ў працэсе сацыяльнай камунікацыі насельніцтва. Веды пра дзікарослыя расліны займаюць важнае месца ў сістэме рацыянальнага прыродакарыстання і з'яўляюцца адным з *фактараў кансалідацыі* беларускага грамадства і павышэння яго экалагічнай самасвядомасці. Дадзены механізм функцыянуе дзякуючы заканадаўчаму замацаванню аховы прыроды, а таксама правядзенню масавых экалагічных мерапрыемстваў, стварэнню экалагічных маршрутаў і сцежак, нацыянальных паркаў. Існуючая сістэма ведаў пра дзікарослыя расліны фарміруе ў грамадстве пазітыўны нацыянальны імідж і *рэпрэзентуе* беларускую культуру на міжнародным узроўні. Працэс адбываецца цераз стварэнне беларускіх нацыянальных брэндаў з расліннымі сімваламі (“БелАвія”, “БелКарт”, “Васількі”, “Купалінка”, “Белтея”, “Калі ласка”, “Valoshki”); лагатыпаў, якія папулярызуюць духоўную спадчыну беларусаў цераз сацыяльную рэкламу, выкарыстанне СМІ і сеткі Інтэрнэт; арганізацыю тэматычных экспазіцый і музеяў, правядзенне траўных фэстаў і майстар-класаў, развіццё нацыянальных рамёстваў з выкарыстаннем дзікарослых раслін. *Упершыню ў этналагічнай навуцы вызначана роля ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучасных этнакультурных працэсах Беларусі.*

4. У развіцці народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст. вылучаецца некалькі этапаў і заканамернасцей: 1) **канец XIX – першая палова XX ст.:** перыяд характэрызуецца дыяхроннай перадачай ведаў пра дзікарослыя расліны, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў матэрыяльнай культуры і з'яўляюцца важнай часткай духоўнай культуры; 2) **другая палова XX – канец XX ст.:** у сувязі з сацыяльна-эканамічным развіццём, ростам прамысловай вытворчасці, урбанізацыяй, павышэннем узроўню адукацыі насельніцтва ўжыванне раслін у матэрыльнай культуры актывізуецца як вынік папулярызацыі ведаў аб іх у сродках масавай інфармацыі. У духоўнай культуры шэраг традыцый трансфармуецца (у радзіннай абраднасці практычнае рацынальнае выкарыстанне выходзіць на першы план; у вясельнай адбываецца замена жывых раслін штучнымі і вырабамі з расліннай сімволікай); 3) **пачатак XXI ст. – 2020-я гг.:** у трэці перыяд у сувязі з ростам глабалізацыі грамадства, тэхналагізацыі, распаўсюджвання сеткі Інтэрнэт адбываецца рэтрансляцыя і аднаўленне традыцыі выкарыстання раслін у матэрыяльнай культуры. У духоўнай культуры веды пра дзікарослыя расліны выступаюць як інструмент

кансалідацыі этнасу і яго рэпрэзентацыі на сусветнай прасторы; адбываецца працэс сінтэзу ведаў як вынік міжэтнічных узаемадзеянняў. *Упершыню ў этналагічнай навуцы зроблена перыядызацыя асноўных заканамернасцей трансфармацыі народных ведаў пра дзікарослыя расліны Беларусі канца XIX – пачатку XXI ст.*

**Асабісты ўнёсак даследчыка**

Даследаванне з’яўляецца цалкам самастойнай працай. У дысертацыі ўпершыню зроблены комплексны аналіз народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Аўтар выкарыстоўваў шырокі спектр крыніц сумежных з этналогіяй навук: гісторыі, фалькларыстыкі, лінгвістыкі, этнабатанікі, батанікі, этнаэкалогіі. Упершыню ў айчыннай этналогіі вызначаны лакальныя асаблівасці, асноўныя заканамернасці трансфармацыі народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст., зроблена перыядызацыя дадзеных заканамернасцей. Таксама ўпершыню прааналізавана значэнне ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучасных этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь. Аўтар, дзякуючы актыўнаму выкарыстанню метада палявых этнаграфічных даследаванняў, уводзіць у навуковы зварот новы палявы матэрыял.

**Навуковая навізна працы**

У дадзеным даследаванні ўпершыню ў айчыннай этналогіі прадстаўлены комплексны аналіз назапашанага этналагічнага, фальклорнага, лінгвістычнага матэрыялаў па народных ведах пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст. У выніку праведзенага даследавання былі выяўлены асноўныя заканамернасці развіцця народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст.; ахарактарызаваны асноўныя аспекты выкарыстання дзікарослых раслін у матэрыяльнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.; вызначана роля дзікарослых раслін у матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў азначанага перыяду; выяўлена значэнне ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучасных этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыйнага даследавання апрабіраваны на VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў” (Мінск, 2015 г.); XI Кангрэсе антраполагаў і этнолагаў Расіі (Екацярынбург, 2015 г.), III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў» (Полацк, 2016), VII

Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў” (Мінск, 2016), І Міжнародным навуковым Кангрэсе беларускай культуры (Мінск, 2016), ХІІ Кангрэсе антраполагаў і этнолагаў Расіі (Іжэўск, 2017 г.); IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў» (Полацк, 2018); VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў” (Мінск, 2018 г.); XIII Кангрэсе антраполагаў і этнолагаў Расіі (г. Казань, 2019 г.); IX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў” (Мінск, 2019 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Жыццё і творчая спадчына А.С. Дэмбавецкага (да 180-годдзя з дня нараджэння) (г. Магілёў, 2020 г.); X Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў” (Мінск, 2020); Навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння знакамітага беларускага этнолага Васіля Кірылавіча Бандарчыка (г. Слуцк, 2020 г.); XI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў” (Мінск, 2021 г.); VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў» (Полацк, 2022 г.); XII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў” (Мінск, 2022 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі адлюстраваны ў 21 публікацыі: 7 з іх – рэцэнзаваныя навуковыя артыкулы, уключаныя ў Спіс навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў; 13 – публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў; 9 – матэрыялы навуковых канферэнцый; 1 – кніжнае навукова-папулярнае выданне па тэме даследавання.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння (112 старонак тэксту), бібліяграфічнага спісу (спіс выкарыстаных крыніц утрымлівае 221 адзінку, спіс публікацый саіскальніка – 21 адзінку).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ

**Глава 1 “Аналітычны агляд літаратуры, крыніцы, метады даследавання”** складаецца з трох раздзелаў і ўключае ў сябе аналітычны агляд літаратуры па тэме даследавання, абгрунтаванне метадалогіі і характарыстыку крыніц.

У **раздзеле 1.1 “Гістарыяграфія праблемы”** прыведзены гістарыяграфічны аналіз па тэме даследавання, які характарызуе ступень вывучанасці народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны. Гісторыю этналагічнага вывучэння традыцыйных уяўленняў беларусаў пра дзікарослыя расліны можна падзяліць на тры асноўныя перыяды: **1) канец XIX ст. – пачатак XX ст.; 2) 1917 г. – канец XX ст.; 3) пачатак XXI ст. – 2020-я гг.** У большасці навуковых прац беларускіх вучоных **канца XIX – пачатку XX ст.** адбывалася актыўнае назапашванне этнаграфічных матэрыялаў пра дзікарослыя расліны, якія ў цэлым мелі апісальны характар. Перыяд характарызуецца складваннем эмпірычнай базы па тэматыцы даследавання і пачатку статыстычнага вывучэння традыцый збору дзікарослых раслін. Шэраг звестак аб дзікарослых раслінах у штодзенным і святочным жыцці падаецца ў працах П. В. Шэйна, М. Я. Нікіфароўскага, У. Дабравольскага. Звесткі аб выкарыстанні раслін у радзіннай і пахавальнай абраднасці беларусаў сустракаюцца ў працах Е. Раманава. Вялікая колькасць інфармацыі пра лекавае выкарыстанне раслін утрымліваецца ў даследаваннях М. Федароўскага. Звесткі агульнага характару аб раслінным свеце ў азначаны перыяд сустракаюцца ў IX томе навукова-папулярнага выдання “Россия: Полное географическое описание нашего Отечества” (1905 г.), дзе ў раздзеле “Раслінны і жывёльны свет” падаецца характарыстыка мясцовай флоры на тэрыторыі беларускіх земляў, з прывядзеннем рэгіянальных назваў раслін; статыстычных матэрыялы “Современное положеніе въ Россіи промысла сбора, культуры и обработки лекарственныхъ растений” (1916 г.) У дадзеных матэрыялах прыводзіўся пералік самых распаўсюджаных для збору дзікарослых лекавых раслін. Аснову для фарміравання новых накірункаў даследавання праблематыкі ў гэты час склалі працы М. Рытава, Е.В. Анічкава.

У другі перыяд **(1917 г. – канец XX ст.)** вывучэнне традыцый народных уяўленняў, звязаных са светам дзікарослых раслін працягнуў А. Сержпутоўскі, Ч. Пяткевіч. Даследаванні Д. К. Зяленіна ахопліваюць увагай рытуальна-магічныя практыкі, звязаныя з дрэвамі ў традыцыйнай духоўнай культуры ўсходніх славян. З пачатку 1930-х гг. савецкая этнаграфічная

навука ў межах агульнанавуковай плыні перажывае перыяд, калі дамінуючым накірункам для даследаванняў становіцца вывучэнне матэрыяльнай культуры насельніцтва. У рэчышчы прыярытэтнага накірунку даследаванняў ў 1960-х гг. з’яўляюцца працы Л. Мінько, прысвечаныя народнай медыцыне і знахарству ў традыцыйнай культуры беларусаў. Даследчык засяроджваецца на рацыянальным выкарыстанні раслін, не вывучаючы рытуальныя аспекты іх ужывання. Сярод грунтоўных прац этнографаў дадзенага перыяду варта адзначыць працы ўкраінскіх даследчыкаў М. А. Носаля, З. Я. Балтаровіч, у якіх глыбока даследавана выкарыстанне дзікарослых раслін у народнай медыцыне ўкраінцаў. Адметнай рысай гістарыяграфіі дадзенага перыяду з’яўляецца адносна невялікая колькасць прац па праблематыцы даследавання і іх скіраванасць на вывучэнне пераважна практычнага аспекта выкарыстання раслін, які з’яўляўся прыярытэтным у тагачаснай этнаграфічнай навуцы.

Трэці перыяд **(пачатак XXI ст. – 2020-я гг.)** характарызуецца павелічэннем колькасці навуковых прац па тэме даследавання, асабліва на мяжы з фалькларыстыкай і этнабатанікай, што звязана з пашырэннем цікавасці да светапоглядных уяўленняў пра дзікарослыя расліны, іх месца ў каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў. У дадзены перыяд пачынаюць з’яўляцца этналагічныя працы, прысвечаныя вывучэнню ведаў пра дзікарослы раслінны свет у духоўнай культуры. Даследаванню лакальнага абраду “Ваджэння Куста”, звязанага з выкарыстаннем дзікарослых раслін у траецкай абраднасці, прысвечаны шэраг прац В. М. Шарай. Этналагічнае даследаванне Т. І. Кухаронак засяроджваецца на адным з важных абрадаў вяснова-летняга цыкла – “завіванне бярозы”. Л. В. Ракава ў працы “Гісторыя на градках: агародніцтва на Беларусі” даследуе агульныя традыцыі агародніцтва беларусаў. Вялікі ўнёсак у распрацоўку айчыннай этнаэкалогіі беларусаў зрабіў К. А. Шумскі. У кнізе “Народные экологические знания белорусов: традиции и современность” ён даследуе функцыянаванне экалагічных ведаў беларусаў, іх развіцце і захаванне. Важнымі для разумення агульных тэндэнцый развіцця адносін чалавека з прыродай у рэчышчы яе засваення з’яўляюцца даследаванні айчынных этнолагаў: Г. І. Каспяровіч, А. Ю. Бабіч.

З канца XX ст. публікуецца значная колькасць даследаванняў у накірунку фалькларыстыкі і этнабатанікі. Сярод айчынных даследчыкаў-фалькларыстаў варта адзначыць Т. В. Валодзіну, В. С. Новак, Т. Б. Варфаламееву, І. В. Казакову. Вялікі ўнёсак у вывучэнне дэндрахраналагічнага коду цераз прызму фальклору зроблены І. А. Швед.

Роля дзікарослай расліннасці ў пахавальных традыцый беларусаў разглядаецца даследчыкам У. Сысовым. Важнае значэнне па акрэсленай праблематыцы ў межах фалькларыстыкі і этнабатанікі маюць даследаванні расійскіх вучоных В. Б. Коласавай, В. В. Усачовай. Т. А. Агапкінай, В. К. Сакаловай, М. І. Талстога. Вывучэннем дзікарослых раслін у межах народнай медыцыны ўкраінцаў прысвечаны даследаванні З. Балтаровіч, І. Каладзюк. Такім чынам, з пачатку ХХ стагоддзя пачынаюць з'яўляцца працы, што мелі на мэце тэарэтычнае асэнсаванне праблемы, асабліва аспектаў, звязаных з практычным рацыянальным выкарыстаннем раслін у штодзенным жыцці беларусаў. У наступныя гады даследаванні працягваюцца ў накірунку фалькларыстыкі, у той час як айчынная гістарыяграфія не мае комплексных даследаванняў, якія б цалкам акрэслівалі этналагічны аспект. Такім чынам, народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў канца ХІХ – пачатку ХХІ стагоддзя ***не з'яўляліся аб'ектам комплексанага этналагічнага даследавання.*** У сувязі з гэтым паўстае неабходнасць вызначыць ролю дзікарослых раслін у матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў канца ХІХ – пачатку ХХІ стагоддзя, а таксама выявіць значэнне ведаў пра іх у сучасных этнакультурных працэсах РБ.

У **раздзеле 1.2 "Крыніцы даследавання"** прыводзіцца аналіз крыніц, якія з'яўляюцца асновай дысертацыйнага даследавання. Крыніцазнаўчая база даследавання складаецца з наступных груп крыніц: матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў аўтара на аснове стандартызаванага і нестандартызаванага інтэрв'ю (агульная колькасць апытанага насельніцтва склала 108 чалавек); апублікаваныя этнаграфічныя крыніцы; матэрыялы перыядычнага друку; архіўныя матэрыялы (архіў ІМЭФ, этнаграфічных матэрыялаў ПДУ, дзяржаўны абласны архіў Віцебскай вобласці); матэрыялы музейных фондаў (калекцыі краязнаўчых музеяў); батанічныя даследаванні (матэрыялы бібліятэкі Горацкай сельскагаспадарчай Акадэміі) і энцыклапедычныя выданні (траўнікі); энцыклапедычныя лінгвістычныя выданні (рэгіянальныя слоўнікі, слоўнікі дыялектных гаворак); інтэрнэт-рэсурсы.

У **раздзеле 1.3 "Метады даследавання"** прыводзіцца метадалагічная база даследавання. Метадалогія дысертацыі ўключае ў сябе як агульнанавуковыя, так і спецыяльныя вузкагістарычныя метады. Да агульнанавуковых адносіцца метад комплекснага падыхода, паводле якога, поўная карціна даследуемай з'явы магчыма толькі пры выкарыстанні здабыткаў сумежных дысцыплін. Наяўнасць значнай колькасці навуковых прац па гісторыі, фалькларыстыцы, батаніцы, лінгвістыцы спрыяе

ўсебаковаму даследаванню народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны.

Сярод спецыяльных метадаў асноўным з'яўляецца метад палявых даследаванняў (фармалізаванае і нефармалізаванае інтэрв'ю-нагляданне, фота- і аўдыёфіксацыя). Падчас палявых даследаванняў матэрыял збіраўся на тэрыторыі 5 абласцей (Полацкі, Докшыцкі раён Віцебскай вобласці; Горацкі раён Магілёўскай вобласці; Добрушскі раён Гомельскай вобласці; Любанскі раён Мінскай вобласці; Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці). Палявыя даследаванні праводзіліся на аснове стандартызаванага і нестандартызаванага інтэрв'ю і з выкарыстаннем апытальніка "Дикорастущие растения и их роль в культуре белорусов". Таксама ў даследаванні выкарыстоўваецца масавы колькасны аналіз; кантэнт-аналіз сродкаў масавай інфармацыі; метад гістарычнай рэканструкцыі; гісторыка-генетычны і гісторыка-параўнальны метады.

**Глава 2 "Дзікарослыя расліны ў матэрыяльнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст."** складаецца з двух раздзелаў і прысвечана даследаванню традыцый выкарыстання дзікарослых раслін у штодзённым побыце беларусаў, у тым ліку ў якасці лекавых сродкаў.

**У раздзеле 2.1 "Ужыванне дзікарослых раслін у штодзённым побыце беларусаў"** цэнтральнае месца адводзіцца традыцыям ужывання раслiннай сыравiны ў матэрыяльнай пабытавай культуры – выкарыстанню драўніны ў дойлідстве і цяслярстве, для вырабу мэблі і прадметаў хатняга ўжытку, плеценых вырабаў; назапашвання раслiннай сыравiны для прыгатавання і захавання ежы, вырабу фарбавальнікаў, венікаў для лазні і г.д. Найбольш прыдатнай для дойлідства лічылася драўніна *хвоі, елкі і дуба*. Пазначаецца, што матэрыял для будаўніцтва выбіралі ў адпаведнасці з цэлай існуючай сістэмай патрабаванняў і забарон – станам лесу, месцам і спосабам высечкі. З драўніны *дуба і ясеня* выраблялі рамы на вокны, а таксама дзверы. Для вырабу мэблі ў хату выкарыстоўвалі *бярозу і алешыну.* З б*ярозы і дуба* выраблялі драўляны посуд, часам выкарыстоўвалі і ліпу. Для пляцення актыўна выкарыстоўвалася *лаза, кара ліпы, бяроста, дубовая і сасновая стружка (дранка), а таксама карані сасны і елкі.*

У даследаванні прыводзіцца пералік найбольш папулярных для збору раслін на беларускіх землях, паводле статыстычных матэрыялаў на пачатак XX ст. Напрыклад, у Гомельскім павеце Магілёўскай губерні – *мята і рамонкі*, а таксама *багун, дзераза, дзівасіл, васілёк, святаяннік*, *ландыш, падбел* і г.д. У Рагачоўскім павеце збіралі *палын, шалфей, мяту, ліпавы цвет, сасновыя і яловыя шышкі*. У Мсціслаўскім і Горацкім паветах – *талакнянку,*

*белену, ваўчкі, браткі, іван-да-мар'ю, дубовую кару, крушыну, ядловец* і г.д. У Барысаўскім павеце Мінскай губерні – *крушыну, спарыш, чальчак, аер, дубраўку, мацярдушку*. На Віцебшчыне – *трыпутнік, чыстацел, святаяннік, бузіну, почкі бярозавыя і ліпавыя, ядловец* і г.д. Збіралі і ўжывалі ў ежу *дзікае шчаўе*, варылі супы з *крапівы,* якую папярэдне ашпарвалі кіпнем, а таксама *лебяды, лопуха*. Выкарыстоўвалася беларусамі ўся веснавая зеляніна – *шчаўе, крапіва, трыпутнік, дзьмухавец, лебяда, кісліца, аер.* У лесе збіралі і нарыхтоўвалі амаль ўсе ядомыя ягады, якія знаходзілі: *чарніцы, брусніцы, журавіны, буякі, маліну, суніцы, каліну, рабіну, шыпшыну*. На традыцыі збору насельніцтвам дзікарослых раслін у другой палове XX ст. негатыўны адбітак пакінула катастрофа на Чарнобыльскай АЭС, у выніку якой вялікая частка лясной зоны Усходняга Палесся і Падняпроўя аказалася забруджанай, а таксама меліярацыя ў 70-80 гг. XX ст., якая стала прычынай скарачэння колькасці лясных багаццяў.

Дзікарослыя расліны з даўніх часоў актыўна выкарыстоўваліся ў народнай кулінарыі ў якасці дадаткаў і прыпраў ў прыгатаванні страваў, а таксама для кансервацыі прадуктаў (*дубовае і вішневае лісце, лісце явара, рабіны*). На *дубовым і кляновым* лісці выпякалі хлеб. Актыўна назапашвалі *маладыя шышкі хвоі*, варылі варэнне з *дзьмухаўцоў.* У якасці традыцыйных напояў ужывалі кісялі, а таксама *бярозавы сок,* разнастайныя кампоты з *шыпшыны, глогу.* У штодзённым побыце насельніцтва дзікарослыя расліны выкарыстоўваліся для выпрацоўкі натуральных фарбавальнікаў для тканін (*зялёнка, мацярдушка, жаўтазель, жоўтая рэзеда, крушына, дубовая кара).*

**У раздзеле 2.2 "Веды пра дзікарослыя расліны ў народнай медыцыне"** асноўная ўвага надаецца традыцыі выкарыстання дзікарослых раслін у якасці лекавых сродкаў. Пазначаецца, што па матэрыялах апытання насельніцтва аднымі з самых распаўсюджаных лекавых траў з'яўляліся: *святаяннік (лац. Hypericum, нар. зверабой), дзівасіл (лац. Ínula), падтыннік (лац. Chelidonium, нар. – чыстацел), сухацвет (лац. Xerānthemum ānnuum), крываўнік (лац. Achilléa), ліпа, дуброўка, крапіва, скрыпень (лац. Epilobium), чабор (лац. Thýmus), рамонкі, мацярдушка (лац. Origanum, нар. – душыца), лопух (лац. Arctium), палын, ваўчкі (лац. Bidens) і г.д.* У якасці лекавых сродкаў расліны-універсалы выкарыстоўваліся ў шматлікіх формах і відах. Расліны сушылі і прымянялі ў выглядзе адвараў, настоек, парашкоў, прымочак, мазі, інгаляцый. Папулярнасцю ў беларускай традыцыі карыстаўся *святаяннік,* які выкарыстоўвалі ў выглядзе водных настоеў пры хваробах страўніка, печані, нырак, галаўных болях; у выглядзе прымочак і ванн пры захворваннях скуры, бранхіяльнай астме. *Дзівасіл* выкарыстоўвалі

для лячэння страўнікавых захворванняў і захворванняў лёгкіх, а таксама для лячэння ран і парэзаў. *Крапіву* ўжывалі ў выглядзе адвараў і водных настояў пры хваробах печані, нырак, страўніка, малярыі, як сродак для ўмацавання валасоў.

Спецыфічнай рысай усходнепалескай традыцыі з'яўляецца выкарыстанне ў якасці лекавых сродкаў таксічных раслін. Шырокавядомым сярод іх з'яўляецца *багульнік балотны ("багун"),* настой з якога ўжывалі для лячэння сухотаў, дызентэрыі, хваробаў нырак; *чамярыца,* адварам якой лячылі каросту. Корань *дуброўкі (лапчаткі прамастойнай; нар.: калган, дубраўка, дзеравянка, узік, вязь-трава, сурмоліна, завязны корань)* выкарыстоўвалі для лячэння страўнікавых і кішэчных хвароб. Пры хваробе на сухоты і іншыя хваробы легкіх прымянялі адвары з лісця *першацвета (прымулы).* Выразным лекавым уздзеяннем пры лёгачных захворваннях адрознівалася кара *дуба* ў форме адвару, а таксама *ліпа, чабор.* Для лячэння ран ужываўся корань *лапчаткі паўзучай.* Пры хваробах суставаў актыўна выкарыстоўваўся *лопух, каштан, жывакост.* Да з'яўлення і актывізацыі выкарыстання ў другой палове XX ст. фармацэўтычнай прамысловасці, дзікарослыя расліны шырока прымяняліся ў народнай ветэрынарыі. У якасці патагонных сродкаў расліннага паходжання для лячэння хатняй жывёлы выкарыстоўвалі *асінавую кару, аер, ядловец і лісце алешыны.* Ад паносу ў жывёлы дзейснымі лічыліся такія травы, як *палын, піжма, аптэчны рамонак, мята, чабор, дуброўка, падтыннік. Аер і палын*, у сваю чаргу, актыўна выкарыстоўвалі для хутчэйшага адкорму жывёлы.

**Глава 3 "Дзікарослыя расліны ў духоўнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст."** складаецца з двух раздзелаў і прысвечана ведам пра дзікарослыя расліны ў каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў азначанага перыяду.

**У раздзеле 3.1 "Дзікарослыя расліны ў каляндарнай абраднасці беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст."** вызначаецца роля народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў каляндарна-абрадавым цыкле. Дрэвы займалі "верхняе" месца ў іерархіі расліннасці, выступаючы асноўнымі элементамі святочных каляндарных абрадаў. У зімовым абрадавым цыкле выкарыстоўвалася вечназялёная *яліна* як сімвал неўміручасці. Важнейшымі часавымі кропкамі, да якіх прымяркоўвалася каляндарная абраднасць зімовага цыклу, з'яўляліся *Каляды і Хрышчэнне (Вадохрышча).* Асвечаныя яловыя галіны надзяляліся значнымі апатрапейнымі ўласцівасцямі. З *Вербнай Нядзеляй* у беларускай культуры звязаны комплекс уяўленняў пра вярбу, як аналаг біблейскай пальмавай галіны. Вылучаюцца дзве формы выкарыстання

славянамі вярбы ў апатрапейнай перспектыве – доўгачасовая і сітуатыўная. Значнымі апатрапейнымі і лекавымі ўласцівасцямі паводле народных уяўленняў беларусаў надзялялася і *траецкая зеляніна*. Магічны сэнс абрадаў траецкага цыкла заключаўся ў забеспячэнні багатага ўраджаю на ўвесь будучы год. Для купальскай традыцыі было характэрна шырокае выкарыстанне *рудэральных раслін* (*крапіва, дзядоўнік*) у якасці абярэга жылля і гаспадаркі. Багацце лакальных традыцый праяўляецца ў выкарыстанні розных відаў раслін у купальскіх варожбах: на Берасцейшчыне – *"доля"*, на Гомельшчыне – *купалка, "пукайла"*, у Цэнтральнай Беларусі – *трыпутнік*, на Падзвінні – *"загадачка"*. У восеньскім календары веды беларусаў аб дзікарослых раслінах базіраваліся вакол святаў Прачыстай, Івана Галавасека і Узвіжання. Пазначаецца, што ў межах каляндарнай абраднасці беларусаў вылучаюцца асноўныя функцыі дзікарослых раслін – *апатрапейная, медыятыўная, прадуцыравальная і лекавая.*

**У раздзеле 3.2 "Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў сямейнай абраднасці беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст."** асноўная ўвага надаецца выкарыстанню дзікарослых раслін у абрадах сямейнага цыкла – радзін, вяселля, пахавання. У радзіннай абраднасці найбольш актыўна расліны ўжываліся на пасляродавым этапе абраду. Пры першым купанні ў ваду абавязкова дадавалі купальскія зёлкі, а таксама адвар траў *(ваўчкі, рамонкі, чыстацел, святаяннік, аер, любіста, буркун, мята, браткі, святаяннік)*. Расліны выкарыстоўвалі і ў якасці абярэга нованароджаных ад шконадоснага ўздзеяння. У рытуале вылівання вады пасля першага купання фігуравалі дрэвы з выразнай мужчынаскай і жаночай сімволікай: для хлопчыка – *дуб* і *ясень,* дзяўчынкі – *яблыня* і *вішня.*

У вясельнай абраднасці расліны выкарыстоўваліся на этапе заручын, у дзявоцкі вечар. Для пляцення вянка для маладых актыўна прымянялі *руту, барвінак, мяту і дзеразу*. У падол вясельнай сукенкі маладой зашывалі *любісту* на увесь перыяд вяселля, ў якасці апатрапея. На Усходнім Палессі фіксаваўся абрад "*елца віць*", у якім фігуравала *яліна* як сімвалі неўміручасці і цыклічнасці жыцця, што звязвалася з пераходам маладых з аднаго сацыяльнага статуса ў іншы. Багатай у параўнанні з іншымі рэгіёнамі з'яўлялася каравайная традыцыя Палесся, дзе для ўпрыгожвання выкарыстоўвалася свежая расліннасць *каліны, ядлоўца, вішні, яблыні,* разам з папяровымі кветкамі і вырабамі з цеста. На Гродзеншчыне вясельны каравай упрыгожвалі дробнымі *рамонкамі.*

Сукупнасць дзікарослых раслін, якія ўжываліся ў пахавальнай абраднасці беларусаў, падзяляецца на некалькі катэгорый: 1) расліны і травы,

якія ўжываліся пры падрыхтоўцы нябожчыка да пахавання і падкладаліся да яго ў труну; 2) дзікарослыя дрэвы, з драўніны якіх выраблялася сама труна; 3) расліны, што выкарыстоўваліся ў знак жалобы і суправаджалі пахавальную працэсію. У рытуале абмывання памерлага выкарыстоўвалі адвар раслін з выразнай медыятыўнай сімволікай (*барвенак, рута, бяліца, крынічнік (расходнік), папаратнік, жабіна лапка).* Для вырабу труны выкарыстоўвалася драўніна розных парод дрэў (*сасна, яліна, дуб).* Адзначана, што пры падрыхтоўцы да пахавання выбар дзікарослых раслін для падкладання ў труну залежаў ад шматлікіх фактараў: 1) рэгіянальных асаблівасцей пахавальнай традыцыі; 2) пола, узросту, сацыяльнага статуса нябожчыка; 3) пары года, у якую адбываецца пахаванне. З гэтай мэтай выкарыстоўваліся *купальскія зёлкі, рута, папаратнік.*

**У главе 4 “Веды пра дзікарослыя расліны ў этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь”** разглядаецца значэнне ведаў пра дзікарослы раслінны свет як інструмента кансалідацыі беларускага этнасу і рэпрэзентацыі нацыянальнай культуры на міжнароднай арэне. Вялікае значэнне для ўмацавання *экалагічнай і этнічнай самасвядомасці* мае фактар захавання прыродных рэсурсаў дзікарослых раслін і папулярызацыя ведаў аб іх. Важным у гэтых умовах з’яўляецца функцыянаванне ў краіне экалагічных маршрутаў, нацыянальных паркаў і запаведнікаў. Вялікую ролю ў захаванні традыцый адыгрываюць музеі і экспазіцыі, прысвечаныя дзікарослым раслінам (музей “Пахі чароўных траў і раслін” у г. Гродна, “Дом траўніка” у в. Стрэльна Іванаўскага раёна, дом-музей народнай медыцыны ў в. Старая Буда Буда-Кашалёўскага раёна), а таксама арганізацыя траўных фестываляў (фэст “Гардовіца” ў Любанскім раёне). Пазначана, што раслінныя сімвалы ў кантэксце этнакультурных узаемаадносінаў выступаюць аб’ядноўваючым элементам у працэсе камунікацыі насельніцтва. Яны з’яўляюцца аднымі з найчасцей узгадваемых асацыятыўных вобразаў беларусаў, звязаных з роднай зямлёй. Беларускія сучасныя брэнды з расліннай сімволікай (“БелАвія”, “БелКарт”, “Васількі”, “Купалінка”, “Белтея”, “Калі ласка”, “Valoshki”) з’яўляюцца адным з асноўных рэпрэзентатыўных інструментаў, якія папулярызуюць духоўную культуру беларусаў як унутры этнаса, так і ў міжэтнічных камунікацыях. Нацыянальныя раслінныя брэнды выконваюць важную ролю, фарміруючы імідж краіны і прасоўваючы яго на міжнародным узроўні. На сённяшні дзень блакітная кветка васілька маркіруе ў прамысловай вытворчасці краіны тыя з’явы, якія мусяць абазначацца словам “нацыянальны”.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Народныя веды аб дзікарослых раслінах у традыцыях беларусаў склаліся гістарычна і залежалі ад прыродна-кліматычнага фактару і спецыфікі мясцовай флоры. Раслінная сыравіна з даўніх часоў з’яўляецца аб’ектам збору і нарыхтоўкі і шырока выкарыстоўвалася ў штодзённым побыце – ужыванне драўніны ў дойлідстве і цяслярстве, для вырабу мэблі і прадметаў хатняга ўжытку, плеценых вырабаў; назапашванне траў для прыгатавання і захавання ежы, вырабу фарбавальнікаў, венікаў для лазні і г.д. Дзікарослыя расліны актыўна нарыхтоўваліся сялянамі не толькі для ўласных патрэб, але і на продаж аптэкам. Расліны беларусы ўжывалі ў ежу і ў якасці лекавых сродкаў, асноўнымі формамі якіх былі адвары, настоі, прымочкі і г.д. Гэтыя формы актыўна працягваюць выкарыстоўвацца і па сённяшні дзень. Сярод нарыхтоўваемых лекавых раслін вылучаецца катэгорыя *раслін-універсалаў* (“ад усіх хвароб”), асноўнай прыкметай якіх з’яўляецца шырокі спектр лекавага дзеяння, надзвычай багатая наменклатура (у тым ліку і лакальная), шырокая распаўсюджанасць традыцыі іх ўжывання на ўсёй усходнеславянскай прасторы. У межах гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў насельніцтва аддавала перавагу тым відам раслін, якія часцей сустракаюцца ў дадзеных шыротах. Спецыфіка праяўляецца і ў наяўнасці лакальных рэгіянальных назваў для асобных траў (калган – *дубраўка, дзеравянка, узік, вязь-трава, сурмоліна, завязны корань).* Традыцыя назапашвання лекавых дзікарослых раслін да сярэдзіны XX ст. адрознівалася сваёй спецыфікай на Палессі, пераважна Усходнім, дзе ў параўнанні з паўночнымі рэгіёнамі краіны яна характарызавалася павялічанай увагай да збору ў якасці лекавых сродкаў моцнатаксічных і атрутных раслін (чамярыца, багун і г.д.). Гэта тлумачыцца як асаблівасцямі мясцовай флоры, так і міжэтнічным узаемадзеяннем.

З канца XX ст. традыцыя ўжывання раслін у якасці лекавых сродкаў характарызуецца сваім аднаўленнем. Звязана гэта не толькі з папулярызацыяй ведаў, але і з актуальнымі тэндэнцыямі звароту да экалагічнай, натуральнай сыравіны ва ўмовах перанасычэння рынку штучнымі матэрыяламі. У сучаснасці назіраецца тэндэнцыя выкарыстання народных ведаў аб якасцях дзікарослых раслін у масавай прамысловай вытворчасці (выпуск гарбаты з мяты, іван-чаю, чабору, васілька) [А4].

2. Асноўнымі функцыямі дзікарослых раслін з’яўляліся *апатрапейная, медыятыўная, прадуцыравальная, лекавая,* якія праяўляліся ў двух цыклах

абраднасці беларусаў – каляндарнай і сямейнай. *Апатрапейная* функцыя раслін прасочваецца ў шырокім выкарыстанні раслін як абярэгаў у сітуатыўнай і доўгачасовай форме. Абарончымі ўласцівасцямі надзяляліся культавыя расліны і дрэвы, якія выконвалі функцыю *медыятараў*, выступаючы пасрэднікамі паміж светам людзей і іншасветам. Наяўнасць такой функцыі відавочна прасочвалася ў традыцыі варожбаў (купальскія варожбы, траецкія варожбы), дзякуючы якой чалавек “атрымоўваў” інфармацыю з таго свету пра найбольш хвалюючыя яго пытанні – жыццё/смерць, здароўе/хвароба, шлюб/адзінота. *Прадуцыравальная* функцыя раслін асабліва яскрава адлюстроўвалася на прыкладзе выкарыстання траецкай зеляніны і зыходзіла з народных уяўленняў пра яе магічныя ўласцівасці. Траецкі “май” выкарыстоўвалі дзеля павышэння ўрадлівасці зямлі, павелічэння пагалоўя жывёлы. *Лекавая* функцыя раслін выразна адлюстроўвалася ў выкарыстанні для лячэння захворванняў траў, большасць з якіх валодаюць навукова падцверджаннымі лекавымі ўласцівасцямі.

У каляндарнай абраднасці дрэвы з’яўляліся цэнтральнымі аб’ектамі важных святаў гадавога кола і ўвасаблялі сімвалічнае значэнне свята (яліна як сімвал неўміручасці на Каляды, вярба як аналаг пальмавай галіны на Вялікдзень, бяроза як сімвал маладосці і росквіту на Троіцу). Пачынаючы з другой паловы ХХ ст. шэраг народных уяўленняў пра расліны паступова трансфармуецца. Лакальная традыцыя адзначэння Вербных Дзядоў на Падзвінні фіксуецца на сённяшні дзень толькі ў памяці насельніцтва. Паступова знікае абрад першага абыходу зямлі з вярбой на Юр’я, які яшчэ ў канцы ХІХ ст. бытаваў у шэрагу рэгіёнаў Беларусі, а сёння фіксуецца ў адзінкавых выпадках на тэрыторыі Падзвіння. З другой паловы ХХ ст. традыцыя ўпрыгожвання вербнай галінкі жывымі кветкамі і раслінамі трансфармуецца і набывае новыя элементы, што праяўляецца ў выкарыстанні кветак са штучных матэрыялаў прамысловага вырабу.

У летнім цыкле календара традыцыя збору купальскіх зёлак пашыраная на ўсёй тэрыторыі Беларусі і мае свае лакальныя варыяцыі ў часавым і відавым аспекце збору раслін, што тлумачыцца разнастайнасцю мясцовай флоры. Паводле лакальнай традыцыі на Палессі і на поўдні Цэнтральнай Беларусі насельніцтва актыўна нарыхтоўвала на Купалле чарніцы. Для купальскіх зёлак характэрна багатая разнастайнасць наменклатуры аднаго віда раслін як паміж гісторыка-этнаграфічнымі рэгіёнамі, так і унутры іх (напрыклад, васількі – “букаўнік”, “бычыннік”, “валынкі”; іван-ды-мар’я – “брат-і-сястра”, “мар’яннік”). Рэгіянальная спецыфіка народных уяўленняў прасочваецца і ў пераважным выкарыстанні ў купальскіх варожбах у якасці

медыятараў розных відаў раслін. Так, на Берасцейшчыне гэта “доля”, на Гомельшчыне – купалка, “пукайла”, у Цэнтральнай Беларусі – трыпутнік, на Падзвінні – “загадачка” і г.д. Традыцыйныя ўяўленні восеньскага календарнага цыкла базіраваліся пераважна вакол святаў Прачыстай, Івана Галавасека і Узвіжання. Для абрадаў гэтага перыяду характэрна выкарыстанне дзікарослай расліннасці ў рытуальна-магічных практыках, а таксама дзікарослых пладовых дрэў, якія раслі ў лесе. У сувязі з гэтым на першае месца выходзіць сістэма народных ведаў, якая рэгламентуе паводзіны чалавека ў лясной прасторы (рытуал вітання з лесам, “ахвярапрыношэння”, забарона секчы тыя ці іншыя віды дрэў).

У радзіннай абраднасці дзікарослыя расліны у найбольшай ступені выкарыстоўваліся ў пасляродавым цыкле абрадаў. Ужываліся расліны ў якасці лекавых і апатрапейных сродкаў, а таксама элементаў рытуальна-магічных практык, з мэтай паспяховага з’яўлення дзіцяці ў свет і ўключэння яго ў грамаду. Уяўленні аб іх магічных уласцівасцях непарыўна звязваліся з іх прыроднымі лекавымі ўласцівасцямі, што адлюстроўвае сінкрэтычны характар народнай культуры. Спецыфіка выкарыстання дзікарослых раслін у радзіннай абраднасці адлюстравана ў відавай разнастайнасці ўжываемых раслін. У межах асобных рэгіёнаў выкарыстанне адных відаў траў пераважала над іншымі. Так, на Усходнім Палессі ў абрадзе першага купання актыўна ўжываецца *любіста, буркун*, у лакальнай традыцыі на Панямонні – *румянка.* Агульнараспаўсюджанай традыцыяй з’яўляецца выкарыстанне такіх відаў траў, як *ваўчкі, рамонак, чыстацел, святаяннік, аер*. Важным аспектам у народных уяўленнях з’яўляўся падзел сімволікі дрэваў, якія фігуравалі у радзінных абрадах, на жаночую і мужчынскую. Згодна полаваму падзелу, у рытуалах, звязаных з уключэннем дзіцяці ў структуру грамадства, прысутнічалі адпаведныя дрэвы. Так, у рытуале вылівання вады пасля першага купання хлопчыка фігураваў *дуб* і *ясень,* дзяўчынкі – *яблыня* і *вішня.* Пачынаючы з другой паловы XX ст. у сувязі з ростам узроўню адукацыі насельніцтва ўяўленні аб магічных уласцівасцях дзікарослых раслін у радзіннай абраднасці паступова знікаюць, а на першае месца выходзіць ўжыванне з рацыянальна-практычнай гігіенічнай патрэбай. На сённяшні дзень дзікарослыя расліны працягваюць выкарыстоўвацца пры купанні дзіцяці, у тым ліку і як лекавы дадатак да сучасных антысептычных сродкаў. Пры гэтым выкарыстанне траў больш не звязваецца з уяўленнямі пра іх магічныя ўласцівасці, бо апошнія амаль не фіксуюцца ў сучаснай традыцыі.

Народныя веды аб выкарыстанні дзікарослых раслін у вясельнай абраднасці звязваліся ў першую чаргу з раслінамі-медыятарамі, што мелі

выразную шлюбную сімволіку і маркіравалі пераход маладых з аднаго сацыяльнага статуса ў іншы. Для пляцення вянка маладой шырока выкарыстоўвалася *рута* і *барвінак.* Сімваламі шлюбу выступалі і вечназялёныя дрэвы – *яліна і сасна.* Так, лакальнай традыцыяй Усходняга Палесся на беларуска-рускім памежжы з’яўляецца абрад *“елца віць”,* у якім яліна выконвала функцыю галоўнага абрадавага дрэва. Спецыфікай у межах гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў характарызаваўся і каравайны абрад, у якім дзікарослыя расліны выконвалі яшчэ і важную эстэтычную функцыю. Разнастайнасць ужываемых для ўпрыгожвання каравая раслін залежала ад пары года, а таксама ад асаблівасцей мясцовай флоры. З сярэдзіны ХХ ст. і да сучаснасці традыцыя выкарыстання дзікарослых раслін у вясельным абрадзе характарызуецца трансфармацыяй у сувязі са знікненнем асобных элементаў абраду разам з іх рытуальна-магічным сэнсам (замена жывых раслін для пляцення вянка нявесты на штучныя, зашыванне кветак у падол сукенкі як абярэг). Выкарыстанне расліннасці ў каравайным абрадзе з магічнай мэтай і прыпісванне раслінам асаблівых уласцівасцей знікае з каравайнага абраду. Расліны паступова перастаюць разглядацца як важныя рытуальныя элементы абраду і працягваюць ужывацца выключна ў эстэтычным накірунку. У сувязі з гэтым узнікае традыцыя ўпрыгожвання каравая расліннымі элементамі штучнага паходжання – кветак, зробленых з паперы, цеста. Адгалоскам традыцыі на сённяшні дзень з’яўляецца аздабленне вясельнага торта расліннай сімволікай.

Дзікарослыя расліны ў пахавальнай абраднасці беларусаў ужываліся ў трох асноўных накірунках: 1) пры падрыхтоўцы нябожчыка да пахавання; 2) для вырабу самой труны; 3) для суправаджэння пахавальнага абраду і працэсіі, у знак жалобы. Яны выступалі своеасаблівымі маркерамі полаўзроставай прыналежнасці і сацыяльнага статуса нябожчыка. Традыцыя выкарыстання дзікарослых раслін у пахавальнай абраднасці беларусаў характарызавалася спецыфікай на ўсіх этапах пахавальнага абраду. У рытуале абмывання памерлага, яго апрананні і атрыбуцыі пахавальнай працэсіі выкарыстоўваліся расліны з выразнай медыятыўнай функцыяй *(яліна, сасна, барвінак, рута)*, якія адначасова надзяляліся і шлюбнай сімволікай. Гэта тлумачыцца падабенствам пахавальнага і вясельнага абрадаў як абрадаў з лімінальнай асобай, якая знаходзіцца ў стане пераходу з аднаго статуса ў іншы. У межах рэгіянальных традыцый для вырабу труны акрамя такіх парод дрэў, як *сасна і яліна*, на Панямонні выкарыстоўвалася драўніна дуба. З канца ХХ ст. з узнікненнем і развіццём сферы рытуальных паслуг з абраду знікае шэраг элементаў выкарыстання дзікарослых раслін пры

падрыхтоўцы нябожчыка да пахавання. Традыцыя ўжывання раслін пры абмыванні памерлага знікае разам з самім рытуалам абмывання, у сувязі з буйным развіццём сферы рытуальных паслуг, якая ўскладае на сябе гэтую неабходнасць. Замест самастойнага вырабу труны перавага аддаецца гатовай прадукцыі. Па-ранейшаму шырока выкарыстоўваюцца дзікарослыя расліны ў атрыбуцыі пахавальнай працэсіі, напрыклад, на сучасным этапе працягвае сваё існаванне народная традыцыя выкарыстання яліны ў пахавальнай абраднасці як дрэва, набліжанага да свету памерлых [А2, А3, А5, А6].

3. Раслінныя сімвалы ў кантэксце этнакультурных узаемаадносінаў з’яўляюцца аб’ядноўваючым элементам у працэсе камунікацыі насельніцтва. На сучасным этапе веды пра дзікарослы раслінны свет выступаюць фактарам, кансалідуючым грамадства, які садзейнічае ўмацаванню як этнічнай, так і экалагічнай самасвядомасці. Яны і па сённяшні дзень займаюць важную частку ў беларускай культурнай прасторы. Якасць функцыянавання адносін “чалавек – прырода” вызначаецца і прагрэсам грамадскай свядомасці: чым больш рацыянальных ведаў аб прыродзе і правілах узаемадзеяння з ёй назапашвае грамадства, тым мацней сувязь, якая, у сваю чаргу, спрыяе яго прагрэсу. Без падтрымання сувязі “чалавек – прырода” любое грамадства не можа паўнавартасна функцыянаваць – такім чынам, яго прыярытэтам павінна з’яўляцца стабільнае падтрыманне дадзенай сувязі ў аптымальным стане. Шматвекавыя традыцыі беражлівага стаўлення да прыроды расліннага свету, правільнага выкарыстання яе дароў фарміруюць экалагічную самасвядомасць беларусаў, у межах якой функцыянуе сістэма рацыянальных адносін паміж чалавекам і прыродай, у якой кожны з бакоў з’яўляецца раўнаважным. У дадзеным выпадку веды пра дзікарослы раслінны свет выступаюць кансалідуючым грамадства інструментам і, у сваю чаргу, садзейнічаюць умацаванню як этнічнай, так і экалагічнай самасвядомасці. Яны і па сённяшні дзень займаюць важную частку ў беларускай культурнай прасторы.

Важнае значэнне для ўмацавання экалагічнай і этнічнай самасвядомасці беларусаў мае фактар захавання прыродных рэсурсаў дзікарослых раслін і папулярызацыя ведаў аб іх ў сучасным культурным полі Рэспублікі Беларусь. Важным інструментам у гэтых умовах з’яўляецца функцыянаванне ў краіне экалагічных маршрутаў, нацыянальных паркаў і запаведнікаў. Масавае прыцягненне ўвагі да нацыянальных прыродных багацяў наведвальнікаў сярод ліку мясцовых жыхароў, а таксама замежных турыстаў дазваляе паглыбіцца ў культурны вопыт беларусаў, а таксама фарміруе пазітыўны вобраз краіны на міжнароднай арэне. Вялікую ролю ў

захаванні народных традыцый выкарыстання дзікарослых раслін сярод сучаснага маладога пакалення беларусаў адыгрывае пашырэнне грамадскага рэзанансу да гэтага пытання. Музеі і экспазіцыі, прысвечаныя дзікарослым раслінам і ведам аб іх, адыгрываюць важную ролю ў папулярызацыі традыцыі ў сучасным беларускім грамадстве. Асаблівай формай узнаўлення традыцыйных ведаў беларусаў аб дзікарослых раслінах можна лічыць мясцовыя святы і фестывалі (як, напрыклад, траўны фэст “Гардовіца” у в. Рачэнь Любанскага раёна). Дзякуючы такім мерапрыемствам адбываецца не толькі аднаўленне народных традыцый духоўнай культуры, але і перадача вопыту падрастаючаму пакаленню. Нацыянальныя традыцыі ўжывання дзікарослых траў на сучасным этапе знаходзяць свой водгук і ў індывідуальнай творчасці асобных майстроў, якія ў сваіх вырабах выкарыстоўваюць дзікарослыя расліны з эстэтычнай мэтай, як элемент упрыгожвання.

Раслінныя сімвалы з’яўляюцца аднымі з найчасцей узгадваемых асацыятыўных вобразаў беларусаў, звязаных з роднай зямлёй. Беларускія сучасныя брэнды з расліннай сімволікай з’яўляюцца адным з асноўных рэпрэзентатыўных інструментаў, якія папулярызуюць духоўную культуру беларусаў як унутры этнаса, так і ў міжэтнічных камунікацыях. Яны выконваюць важную ролю, фарміруючы нацыянальны імідж і прасоўваючы яго на міжнародным узроўні, стымулюючы эканамічнае развіццё. Так, на сённяшні дзень блакітная кветка васілька маркіруе ў прамысловай вытворчасці краіны тыя з’явы, якія мусяць абазначацца словам “нацыянальны”. Нацыянальныя авіялініі Белавіа маюць сваім сімвалам васілёк, як і банкаўская сістэма Белкарт. Сетка рэстаранаў нацыянальнай кухні Беларусі носіць назву “Васількі”. Да Еўрапейскіх гульняў 2019 г. харчовая прамысловасць краіны наладзіла выпуск васількавага марожанага [А7].

4. У сістэме народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны на працягу перыяду канца XIX – пачатку XXI ст. адбываецца шэраг трансфармацый, у сувязі з чым паўстае неабходнасць вылучыць перыядызацыю і асноўныя заканамернасці дадзеных працэсаў. Такім чынам, у развіцці народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст. вылучаецца некалькі этапаў і заканамернасцей: 1) канец XIX – першая палова XX ст.: перыяд характэрызуецца дыяхроннай перадачай ведаў пра дзікарослыя расліны, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў матэрыяльнай культуры і з’яўляюцца важнай часткай духоўнай культуры; 2) другая палова XX – канец XX ст.: у сувязі з сацыяльна-эканамічным

развіццём, ростам прамысловай вытворчасці, урбанізацыяй, павышэннем узроўню адукацыі насельніцтва ўжыванне раслін у матэрыльнай культуры актывізуецца як вынік папулярызацыі ведаў аб іх у сродках масавай інфармацыі. У духоўнай культуры шэраг традыцый трансфармуецца (у радзіннай абраднасці практычнае рацынальнае выкарыстанне выходзіць на першы план; у вясельнай адбываецца замена жывых раслін штучнымі і вырабамі з расліннай сімволікай); 3) пачатак XXI ст. – 2020-я гг.: у трэці перыяд у сувязі з ростам глабалізацыі грамадства, тэхналагізацыі, з’яўлення сеткі Інтэрнэт адбываецца рэтрансляцыя і аднаўленне традыцыі выкарыстання раслін у матэрыяльнай культуры. У духоўнай культуры веды пра дзікарослыя расліны выступаюць як інструмент кансалідацыі этнасу і яго рэпрэзентацыі ў сусветнай прасторы; адбываецца працэс сінтэзу ведаў як вынік міжэтнічных узаемадзеянняў [А2 – А7].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

Прадстаўленыя ў працы матэрыялы і тэарэтычныя палажэнні могуць быць выкарыстаны ў якасці інструмента папулярызацыі народных ведаў пра дзікарослыя расліны з мэтай павышэння экалагічнай самасвядомасці беларусаў і ўмацавання традыцый рацыянальнага прыродакарыстання; для распрацоўкі перспектыўных накірункаў развіцця экалагічнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь з мэтай фарміравання пазітыўнага вобразу на сусветнай арэне; пры рэканструяванні народных абрадаў каляндарнага і сямейнага цыкла з выкарыстаннем дзікарослых раслін.

Дысертацыйная работа пашырае веды па гісторыі духоўнай культуры і робіць ўнёсак у комплекснае даследаванне беларускага этнасу канца XIX – пачатку XXI ст. Яна спрыяе захаванню традыцыйнай культуры беларусаў і павелічэнню цікавасці да духоўнай спадчыны. Дзякуючы папулярызацыі дзікарослых раслін, выкарыстоўваемых ў народных традыцыях, праца садзейнічае прывіванню высокай экалагічнай свядомасці і культуры паводзін на прыродзе. Значнасць даследавання заключаецца і ў магчымасці прымянення яго вынікаў для далейшай распрацоўкі праблем развіцця народных ведаў у традыцыях беларусаў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання ўкаранёны ў адукацыйным працэсе пры падрыхтоўцы студэнтаў ВНУ і выкладання дысцыплін “Этналогія і этнаграфія Беларусі”, “Гісторыя Беларусі”, “Гісторыя сусветнай культуры”, “Гістарычнае краязнаўства Беларусі” у Полацкім дзяржаўным універсітэце. Акрамя таго, вынікі даследавання могуць быць выкарыстаныя пры напісанні падручнікаў і навукова-метадычных матэрыялаў, а таксама ў

якасці практычных рэкамендацый пры распрацоўцы дзяржаўных праграм па папулярызацыі духоўнай спадчыны беларусаў у краіне і за мяжой цераз шырокавядомыя традыцыйныя раслінныя сімвалы.

Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы тэматычных экскурсій, для стварэння экспазіцыйна-выставачных праектаў, напісання сцэнарыяў музейна-педагагічных заняткаў, а таксама ў распрацоўцы перспектыўнага плана камплектавання фондавай калекцыі Прыродна-экалагічнага музея Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Публікацыі ў навуковых рэцэнзаваных часопісах**

1. Шаўчэнка, Я. С. Эвалюцыя традыцыйных уяўленняў беларусаў аб дзікарослых раслінах у традыцыйнай каляндарнай абраднасці к. XIX – пач. XXI стст: гістарыяграфія праблемы / Я. С. Шаўчэнка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2015. – Вып. 18. – С. 321–327.

2. Шаўчэнка, Я. С. Традыцыйныя ўяўленні беларусаў пра дзікарослыя расліны: летні цыкл каляндарнай абраднасці / Я. С. Шаўчэнка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2015. – Вып. 19. – С. 304–309.

3. Шаўчэнка, Я. С. Выкарыстанне дзікарослых раслін у каляндарнай абраднасці беларусаў (зімовы і вясенні цыклы) / Я. С. Шаўчэнка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2016. – Вып. 20. – С. 447–453.

4. Кнурэва (Шаўчэнка), Я. С. Выкарыстанне дзікарослых раслін у штодзённым побыце беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст. / Я. С. Кнурэва (Шаўчэнка) // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2016. – Вып. 21. – С. 186–191.

5. Кнурэва, Я. С. Выкарыстанне дзікарослых раслін у пахавальнай абраднасці беларусаў канца XIX – XX ст. (агульная характарыстыка) / Я. С. Кнурэва // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2017. – Вып. 22. – С. 319–323.

6. Шаўчэнка, Я. С. Выкарыстанне дзікарослых раслін у радзіннай абраднасці беларусаў канца XIX – пачатку XXI стст. / Я. С. Шаўчэнка // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2023. – Вып. 33. – С. 347–354.

7. Шевченко, Я. С. К вопросу о влиянии традиционных знаний о дикорастущих растениях на формирование экологического самосознания молодёжи Беларуси / Я. С. Шевченко // Современная молодежь и общество : сб. науч. ст. / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2023. – Вып. 11. – С. 93–96.

**Публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў**

8. Шевченко, Я. С. К вопросу о месте и роли растительных символов в формировании этнической идентичности белорусов среди

молодежи Гродненщины / Я. С. Шевченко // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Гродна, 2021. – С. 433–435.

9. Шаўчэнка, Я. С. Дзікарослыя расліны ў вясельнай абраднасці беларусаў канца XIX – пачатку XXI стст. / Я. С. Шаўчэнка // Беларуская этнаграфія, этналогія і антрапалогія : зб. навук. арт. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі. – Мінск, 2022. – Вып. 1. – С. 99–106.

10. Шаўчэнка, Я. С. Дзікарослыя расліны ў сучасным жыцці беларусаў: перспектывы выкарыстання / Я. С. Шаўчэнка // Беларуская этнаграфія, этналогія і антрапалогія : зб. навук. арт. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі – Мінск, 2022. – Вып. 1. – С. 106–114.

11. Шаўчэнка, Я. С. Традыцыі назапашвання і практычнага выкарыстання дзікарослых раслін у якасці лекавых сродкаў беларусамі ў канцы XIX – пачатку XXI стст. / Я. С. Шаўчэнка // Беларуская этнаграфія, этналогія і антрапалогія : зб. навук. арт. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі. – Мінск, 2023. – Вып. 2. – С. 285–298.

**Навукова-папулярнае кніжнае выданне**

12. Кнурэва, Я. С. Дзікарослы раслінны свет у традыцыйных уяўленнях і сучасным жыцці беларусаў / Я. С. Кнурэва. – Мінск : Беларус. навука, 2019. – 207 с.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

13. Шевченко, Я. С. Специфика традиционных представлений белорусов о дикорастущих растениях в конце XIX века / Я. С. Шевченко // XI конгресс антропологов и этнологов России. Контакты и взаимодействие культур : сб. материалов, Екатеринбург, 2–5 июля 2015 г. / Ассоц. антропологов и этнологов России [и др.] ; редкол.: В. А. Тишков [и др.]. – М. ; Екатеринбург, 2015. – С. 334.

14. Шаўчэнка, Я. С. Спецыфіка традыцыйных уяўленняў беларусаў Падзвіння і Ўсходняга Палесся аб лекавых раслінах / Я. С. Шаўчэнка // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. дак. і тэз. VI Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 19–20 лістап. 2015 г. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 545–547.

15. Шаўчэнка, Я. С. Дзікарослыя расліны ў каляндарнай абраднасці беларусаў Падзвіння канца XIX – XXI стст. / Я. С. Шаўчэнка // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. III Міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14–15 крас. 2016 г. : у 2 ч. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, А. І. Корсак. – Наваполацк, 2016. – Ч. 1. – С. 243–250.

16. Шаўчэнка (Кнурэва), Я. С. Традыцыйныя ўяўленні беларусаў Паазер'я і Заходняга Палесся аб дзікарослых раслінах канца XIX – XX ст. (каляндарная абраднасць) / Я. С. Шаўчэнка (Кнурэва) // Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры : зб. матэрыялаў, Мінск, 5– 6 мая 2016 г. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 774–777.

17. Кнурева, Я. С. Дикорастущие растения в календарной обрядности белорусов XX–XXI вв. / Я. С. Кнурева // XII конгресс антропологов и этнологов России. Миссия антропологии и этнологии: научные традиции и современные вызов : сб. материалов, Ижевск, 3–6 июля 2017 г. / Ассоц. антропологов и этнологов России [и др.]. – М. ; Ижевск, 2017. – С. 444.

18. Кнурэва, Я. С. Традыцыі выкарыстання дзікарослых раслін у др. пал. XX ст. (на прыкладзе вёсак Мікалаева і Барава Іўеўскага раёна) / Я. С. Кнурэва // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. дакл. і тэз. VIII Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7–8 верас. 2017 г. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 515–518.

19. Кнурэва, Я. С. Спецыфіка выкарыстання дзікарослых раслін беларусамі Падзвіння ў абрадах вясновага цыклу канца XIX – пач. XXI стст. [Электронный ресурс] / Я. С. Кнурева // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук.-практ. канф. да 50-годдзя Полац. дзярж. ун-та, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

20. Кнурэва, Я. С. Народныя веды беларусаў Падняпроўя пра дзікарослыя расліны / Я. С. Кнурэва // Жизнь и творческое наследие А. С. Дембовецкого : к 180-летию со дня рождения : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Могилев, 13 марта 2020 г. / Центр исслед. белорус. культуры, яз. и лит. НАН Беларуси [и др.] ; сост.: В. В. Шейбак, Е. Н. Изергина, Я. С. Кнурева ; редкол.: А. И. Локотко (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2021. – С. 213–217.

21. Шевченко, Я. С. Современные представления о дикорастущих растениях среди молодежи Гродненщины как инструмент формирования экологического самосознания и этнической идентичности белорусов / Я. С. Шевченко // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. / Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі. – Мінск, 2016. – Вып. 4. – С. 640–645.

## РЭЗЮМЭ

**Шаўчэнка Яна Сяргееўна**

## НАРОДНЫЯ ВЕДЫ ПРА ДЗІКАРОСЛЫЯ РАСЛІНЫ Ў ТРАДЫЦЫЯХ БЕЛАРУСАЎ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XXI СТ.)

***Ключавыя словы*:** дзікарослыя расліны, народныя веды, традыцыі беларусаў, матэрыяльная культура, штодзённы побыт, народная медыцына, духоўная культура, каляндарная абраднасць, сямейная абраднасць, этнаэкалогія, экалагічная самасвядомасць, рацыянальнае прыродакарыстанне.

***Мэта даследавання:*** выяўленне заканамернасцяў развіцця народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст.

***Метады даследавання***: метад палявых даследаванняў, масавы колькасны аналіз, кантэнт-аналіз інтэрнэт-рэсурсаў, метад гістарычнай рэканструкцыі, гісторыка-генетычны і гісторыка-параўнальны метады.

***Навуковая навізна даследавання.*** У дадзеным даследаванні ўпершыню ў айчыннай этналогіі прадстаўлены комплексны аналіз назапашанага этналагічнага, фальклорнага, лінгвістычнага матэрыялаў па народных ведах пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст. У выніку праведзенага даследавання былі выяўлены асноўныя заканамернасці развіцця народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст.; ахарактарызаваны асноўныя аспекты выкарыстання дзікарослых раслін у матэрыяльнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.; вызначана роля дзікарослых раслін у духоўнай культуры беларусаў азначанага перыяду; выяўлена значэнне ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучасных этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь.

***Рэкамендацыі да выкарыстання.*** Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў распрацоўцы дзяржаўных праграм па захаванні навакольнага расліннага свету і ведаў аб ім, а таксама раскрыцці патэнцыялу краіны ў галіне экатурызму; у навукова-даследчых праграмах, у адукацыйнай, выхаваўчай, сацыяльнай рабоце.

***Галіна выкарыстання.*** Гісторыя, этналогія, фалькларыстыка, этнабатаніка, этнаэкалогія, краязнаўства.

## РЕЗЮМЕ

**Шевченко Яна Сергеевна**

**НАРОДНЫЕ ЗНАНИЯ О ДИКОРАСТУЩИХ РАСТЕНИЯХ В ТРАДИЦИЯХ БЕЛОРУСОВ ( КОНЕЦ XIX – НАЧАЛО XXI В.)**

***Ключевые слова*:** дикорастущие растения, народные знания, традиции белорусов, материальная культура, быт, народная медицина, духовная культура, календарная обрядность, семейная обрядность, этноэкология, экологическое самосознание, рациональное природопользование.

***Цель исследования*:** определение закономерностей развития народных знаний белорусов о дикорастущих растениях конца XIX – начала XXI в.

***Методы исследования*:** метод полевых исследований, массовый количественный анализ, контент-анализ интернет-ресурсов, метод исторической реконструкции, историко-генетический и историко-сравнительный методы.

***Научная новизна исследования.*** В данном исследовании впервые в отечественной этнологии представлен комплексный анализ накопленного этнологического, фольклорного, лингвистического материалов о народных знаниях про дикорастущие растения в белорусских традициях конца XIX – начала XXI века. В результате проведенного исследования выявлены основные закономерности развития народных знаний белорусов о дикорастущих растениях конца XIX – начала XXI веков; описаны основные аспекты использования дикорастущих растений в материальной культуре белорусов конца XIX – начала XXI веков; определена роль дикорастущих растений в духовной культуре белорусов указанного периода; раскрывается значение знаний о дикорастущих растениях в современных этнокультурных процессах Республики Беларусь.

***Рекомендации по использованию.*** Результаты диссертации могут быть использованы при разработке государственных программ сохранения окружающего растительного мира и знаний о нем, а также раскрытия потенциала страны в сфере экотуризма; в исследовательских программах, в образовательной, воспитательной, социальной работе.

***Отрасль использования.*** История, этнология, фольклористика, этноботаника, этноэкология, краеведение.

## SUMMARY

**Shevchenko Yana Sergeevna**

# FOLK KNOWLEDGE ABOUT WILD PLANTS IN BELARUSIAN TRADITIONS (E. XIX C. – EARLY XXI C.)

***Key words:*** wild plants, folk knowledge, Belarusian traditions, material culture, everyday life, folk medicine, spiritual culture, calendar rituals, family rituals, ethnoecology, ecological self-awareness, rational use of natural resources.

***Objective:*** to establish the patterns of development of Belarusian folk knowledge about wild plants of the late XIX – early XXI century.

***Methods:*** field research method, mass quantitative analysis, content analysis of Internet resources, method of historical reconstruction, historical-genetic and historical-comparative methods.

***Scientific novelty of the research.*** This study, for the first time in domestic ethnology, presents a comprehensive analysis of accumulated ethnological, folklore, linguistic and materials on folk knowledge about wild plants in Belarusian traditions of the late 19th – early 21st centuries. As a result of the study, the main patterns of development of folk knowledge of Belarusians about wild plants of the late 19th – early 21st centuries were identified; the main aspects of the use of wild plants in the material culture of Belarusians of the late 19th – early 21st centuries are described; the role of wild plants in the spiritual culture of Belarusians of this period is determined; the significance of knowledge about wild plants in modern ethnocultural processes of the Republic of Belarus is revealed. ***Recommendations for use.*** The results of the dissertation can be used in the development of state programs for the conservation of the surrounding flora and knowledge about it, as well as unlocking the country's potential in the field of ecotourism; in research programs, in educational, social work.

***Industry of use.*** History, ethnology, folkloristics, ethnobotany, ethnoecology, local history.

